УДК 385.81

**Дзікі Мікалай Андрэевіч,**
курсант 1 курса
Навуковы кіраўнік Капковіч М. І.
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# МУЖНАСЦЬ І ГЕРАІЗМ КУПЯЦІЦКІХ ПАДПОЛІШЧАЎ «ЗАПАРОЖЦЫ»

**Анатацыя.** У даследаванні прадстаўлена дзейнасць купяціцкай моладзевай падпольнай групы «Запарожцы», якая дзейнічала ў гады Вялікай Айчыннай вайны у в. Купяцічы Пінскага раена Брэсцкай вобласці Беларусі. На падставе архіўных матэрыялаў, публікацый В. П. Кіселева і ўспамінаў сведак разглядаюцца сувязі падпольшчаў з партызанскім атрадам «Храбрацы», характар дыверсійна-разведвальных аперацый, канкрэтныя атакі на эшалоны, склады і бронетэхніку, а таксама ўклад падпольнага руху ў вызваленне Пінскага раена.

**Ключавыя словы:** Купяцічы, «Запарожцы», Пінскі раен, падпольны рух, партызаны, дыверсіі, гістарычная памяць.

**Увядзенне.** Актуальнасць тэматыкі абумоўлена важнасцю захавання памяці пра лакальныя прыклады мужнасці і патрыятызму. Аб’ект даследавання – моладзевая падпольная група «Запарожцы» з в. Купяцічы. Мэта – вывучыць баявую дзейнасць групы, яе ўклад у набліжэнне Перамогі і выхаваўчае значэнне гэтай гісторыі для моладзі. У рабоце выкарыстаны ўспаміны, журналісцкія і архіўныя крыніцы [1].

**Асноўная частка.** *Партызанская брыгада «Чорны»*. Партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі меў масавы характар. Адным з арганізатараў быў І. Н. Банаў («Чорны»), пад кіраўніцтвам якога дзейнічалі разведвальна-дыверсійныя атрады ў Пінскай і суседніх вобласцях. Купяціцкія падпольшчы падтрымлівалі сувязь з брыгадай, атрымлівалі заданні і перадавалі звесткі ў штаб [2].

*Атрад спецназначэння «Храбрацы».* спецатрад «Храбрацы» (камандзір А. М. Рабцевіч) выконваў маштабныя дыверсіі на чыгуначных камунікацыях, складах і аэрадромах. Атрад забяспечваў збор разведвальных даных і падрыхтоўку мясцовых падпольных груп, пастаўляў боепрыпасы і міны для сумесных аперацый. Дзеннікі і ўспаміны камандзіра змяшчаюць звесткі пра дзеянні «Запарожцаў» [3].

*Купяціцкая падпольная група «Запарожцы».* Група «Запарожцы» (спачатку 8–12 чалавек, узрост 17–25 гадоў) арганізавана Ф. Джыгіла і Ф. Лісовецам. Асноўныя віды дзейнасці: прадухіленне вывезення жыхароў на працу ў Германію, збор і перадача разведвальных даных, распаўсюджванне сводак Савінфармбюро, дыверсіі супраць эшалонаў, складаў, танкаў і аэрад-

ромаў. Ключавыя аперацыі: падрыў склада авіябомб у Галеве (20.04.1944), замініраванне танкаў (14.05.1944), падрывы эшалонаў на перагоне Пінск–Гарадзішча (25.05 і 09.06.1944). У ліпені 1944 г. удзельнікі групы садзейнічалі вызваленню Купяцічаў[4].

Аналіз паказвае, што дзеянні моладзевай групы мелі стратэгічнае значэнне для дэзарганізацыі нямецкіх камунікацый і павышэння маральнага супраціву ў тыле ворага. Даследаванне падкрэслівае выхаваўчую ролю лакальнай гісторыі і неабходнасць захавання ўспамінаў пра подзвігі малой Радзімы.

*Анкетаванне і выхаваўчае значэнне.* У красавіку 2024 г. апытана 53 чалавека: большая частка не ведала пра «Запарожцаў». Пасля інфармацыйнай работы ў кастрычніку 2024 г. сярод школьнікаў (34 рэспандэнты) вядомасць тэмы істотна вырасла. Вынікі пацвярджаюць педагагічную значнасць лакальных даследаванняў для фарміравання патрыятызму [5].

Табліца 1. Ключавыя баявыя аперацыі падпольнай групы «Запарожцы»

| Дата | Аб'ект аперацыі | Удзельнікі (прыкладна) | Вынік |
|---|---|---|---|
| 20.04.1944 | Склад авіябомб, аэрадром Галево | А. Г. Лісовец, І. М. Пекун, І. П. Пекун, С. П. Журбіла | Падрыў; значная шкода |
| 14.05.1944 | Два танкі брыгады СС | Ф. Лісовец, В. П. Сімонаў | Танкі падарваны пры выездзе; экіпажы знішчаны |
| 25.05.1944 | Эшалон на перагоне Пінск–Гарадзішча | Ф. Джыгіла, А. Пекун, С. Журбіла, Д. Лопушка | Разбіты платформы; шмат забітых і параненых; рух прыпынены |
| 09.06.1944 | Складзены састаў на перагоне Гарадзішча–Пінск | Удзельнікі групы (падрабязней у архівах) | Пашкоджаны паравозы; страты сярод ворага; шлях выведзены з ладу |
| 13.07.1944 | Бой за веску Купяцічы | «Запарожцы» сумесна з часткамі Чырвонай Арміі | Вызваленне вёскі; страты ворага |

**Заключэнне.** Даследаванне дазволіла сістэматызаваць звесткі пра баявыя справы купяціцкіх падпольшчаў, падкрэсліць іх уклад у падрыў ворагавых камунікацый і паказаць выхаваўчае значэнне захавання мясцовай памяці. Група «Запарожцы» – прыклад самаахвярнасці і грамадзянскай адказнасці; успаміны і дакументы пра іх неабходна збіраць і публікаваць.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Вайна ў Пінску: аповеды пінскіх падпольшчаў і жыхароў горада / Уздзенскі Б. С. – Ростаў-на-Доне. – 2009. – 232 с.

2. За межамі магчымага / В. П. Кіселеў. – М., 1986. – 44 с.
3. «Запарожцы» / В. П. Кіселеў. – Газета «Заря», 21.01.1981. – 156 с.
4. Памяць. Пінскі раен. – Мінск: БелТА, 2003. – 152 с.
5. «Трагедыі весак Піншчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Купяцічы». – Газета «Пінскі веснік», 17.03.2023. – №11.